©БДАМ

# КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫ ТЭКСТ ЭПОХІ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ Ў ІНДЫВІДУАЛЬНА-КАМПАЗІТАРСКІХ РАШЭННЯХ (ТВОРЧЫ ВОПЫТ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ АПОШНЯЙТРЭЦІ XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ)

***Т. Т. ТРАФІМЧУК***, **Т. С. ЯКІМЕНКА**

The article considers the trends of «historicism» in the Belarusian music of the last third of the XX – beginning of the XXI century. Specifically allocated for treatment of Belarusian composers to the images of the Middle Ages. Particular embodiment of the cultural and historical text of the Middle Ages considered the example of individual works of Belarusian composers

Ключавыя словы: Сярэдневякоўе, культурна-гістарычны тэкст, беларускія кампазітары

Мастацкую панараму беларускай культуры апошняй трэці XX – пачатку XXI стст. выразна акрэслівае тэндэнцыя “гістарызму”. Звязаная з ідэяй гістарычнай памяці, як асновы бесперапыннай сувязі часоў, яна выразна выяўляе тую адметнасць творчага мыслення, пры якой аўтар, “прыналежны сучаснай эпосе, адчувае таксама сувязь з іншымі эпохамі, непасрэдныя зносіны з тым, што знаходзіцца за рамкамі яго вопыту, за межамі яго самога” [1; с. 128].

Паказальным вектарам мастацкай гістарычна арыентаванай творчасці становіцца ўстойлівая цікавасць да эпохі беларускага Сярэдневякоўя (V–XV стст.). Культурныя ўніверсаліі, сакральныя топасы, сімвалы, помнікі, імёны і падзеі – усё тое, што складае шматмерны культурна-гістарычны тэкст Сярэдніх вякоў, актуалізуецца таксама і ў кампазітарскіх сачыненях мяжы XX–XXI стст.

Істотна, што даследаванне музычнай творчасці, якая скіравана да Дыялогу амаль дыяметральна разведзеных культур, патрабуе пэўнай метадалагійнай шматпланавасці. Менавіта пры асэнсаванні сучасных кампазітарскіх увасабленняў беларускага Сярэдневякоўя своечасовым і карысным апынаецца прыцягненне да ўласна музыказнаўчага аналізу асноў сумежных галінаў гуманітарыстыкі: тэорыі тэксту, топікі і семіётыкі. Зварот да такіх крос-культурных і навуковых катэгорый, як “тэкст”, “сімвал”, “топас”, дазваляе, з аднаго боку, паглыбіць, а, з другога боку, адпаведным чынам канкрэтызаваць разгляд музычных артэфактаў, дзе гістарычная рэальнасць перакрыжоўваецца са свабодай творчай фантазіі, а індывідуальна-аўтарскае шчыльна ўзаемазвязана з агульна-ўніверсальным.

Найбольш рэпрэзентатыўнай галіной пры разглядзе індывідуальна-аўтарскіх рашэнняў культурна-гістарычнага тэксту беларускіх Сярэдніх вякоў паўстае галіна сімфанічнай і вакальна-сімфанічнай музыкі. Кожны твор раскрывае ўнікальнае мастацкае бачанне аддаленай значнай часавай перспектывай эпохі. Так, А. Мдывані ў сваіх Пятай і Шостай сімфоніях праз манументальнасць разгорнутых музычных палотнаў, характэрны сінтэз эпікі, тэатральнасці і карціннасці дэманструе абагульнена-філасофскі падыход да старажытнай гісторыі і культуры Беларусі. В. Войцік у сваёй Першай сімфоніі тонка і ў той жа час амаль сцэнічна, карцінна перадае “сітуацыю разлому” – пастаяннае

супрацьпастаўленне “злавеснага” і “малітоўнага” пачаткаў. В. Кузняцоў у “Сярэдневяковай музыцы для струнных і ўдарных” і Л. Сімаковіч у “Гімнах беларускага Сярэднявечча” засяроджваюць творчую ўвагу на выяўленні шматсэнсавасці апазіцыі сакральнай і несакральнай асноў эпохі Сярэдніх вякоў. Аб’ядноўвае гэтыя творы тое адзінае і галоўнае, а менавіта: мастакоўскае адчуванне транстэмпаральнасці культурна-гістарычнага тэксту Сярэдневякоўя і разуменне яго як складанага метасімвала і топаса, арганічна інтэграванага ў беларускую мастацкую (музычную) культуру канца XX - пачатку XXI стагоддзяў.

**Літаратура**

1. *Шимилевич А.* Историзм в архитектуре Беларуси XIX века // Культура. Наука. Творчество. 2008. С. 127–133.